ных отделений, программами развития, организует форумы по вопросам равенства и расширения прав и возможностей женщин [5].

Подводя итог, можно сказать о том, что феминистское движение Соединенных Штатов представлено большим разнообразием различных организаций, фондов, центров, ассоциаций, которые охватывают все сферы деятельности: политическую, экономическую, культурную и социальную. Необходимо также отметить, что крупнейшие феминистские организации являются беспартийными.

**Литература**


1. Интернет-адрес: http://ravnopravka.ru/2011/12/радикальные-феминистки-70х-красные-чул/.
2. Интернет-адрес: http://legal-dictionary.thefreedictionary.com/National+Organization+for +Women.
3. Интернет-адрес: http://www.feministsforlife.org/our-mission-organization/.
4. Интернет-адрес: http://lwv.org/content/about-league.
5. Интернет-адрес: http://www.feminist.org/welcome/index.html.


## ДАСЛЕДАВАННЕ НЕАБХОДНАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ЛАГІСТЫЧНАЙ ПРЫВАБНАСЦІ ЯК ФАКТАРУ ПАВЕЛІЧЭННЯ ГРАШОВЫХ ПАСТУПЛЕННЯЎ У РЭСПУБЛІКАНСКІ БЮДЖЭТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ


**К. М. Нашчынец**


Праведзены аналіз статыстычных дадзеных імпарту тавараў у Рэспубліку Беларусь у адпаведнасці з апошнімі звесткамі сайта міжнароднай базы статыстыкі гандлю UN Comtrade Database (за 2013 год) [1].

На сённяшні дзень нарматывы размеркавання сум увазных мытных пошлін для кожнай дзяржавы-члена Еўразійскага эканамічнага саюза ўсталёўваюцца ў наступных памерах: Рэспубліка Арменія – 1,13 %; Рэспубліка Беларусь – 4,65 %; Рэспубліка Казахстан – 7,25 %; Расійская Федэрацыя – 86,97 %. Для даследавання ўзяты нарматывы размеркавання на 2013 г. у памерах: Рэспубліка Беларусь – 4,7 %; Рэспубліка Казахстан – 7,33 %; Расійская Федэрацыя – 87,97 %.

У ходзе даследавання змадэліравана сітуацыя правядзення Рэспублікай Беларусь «лагістычнага манёўру» – паляпшэння лагістычнай прывабнасці і, як следства, перацягванне пэўнага аб'ёму тавару на сваю тэрыторыю, напрыклад – 100 тыс. тон тавараў (гл. Табліцу і Малюнак 1).

Мэтазгодна ацэньваць дынаміку зменаў выніковых сум паступленняў у бюджэт.

ВС = МП + ПП, дзе ВС – вынiковая сума, МП – мытныя пошлiны пасля размеркавання, ПП – падатак на прыбытак. Падатак на прыбытак складае 18 % ад розніцы паміж коштам тавару з улікам прыбытку (для арыентыру – 5 %) і чыстым коштам тавару.

ПП = 18 % * 5 % * К, дзе 18 % – стаўка падатку на прыбытак, К – кошт тавару. Формула ўяўляе сабой прамую залежнасць (паміж К і ПП) – чым вышэй К, тым вышэй ПП.

*Табліца 1*

**Сума мытных пошлін да і пасля размеркавання падчас правядзення «лагістычнага манёўру»**

| | | 100 тыс. тон па цане РБ | | | 100 тыс. тон па цане РФ | | | 100 тыс. тон па цане РК | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Груп па 0803 Бана ны | Вага, млн. кг | Кошт, млн. $ | Сума сабра ных мыт-ных пош-лін, млн $ | Сума мыт-ных пошлін пасля размер каван-ня, млн $ | Кошт, млн. $ | Сума сабра-ных мыт-ных пошлін млн $ | Сума мыт-ных пошлін пасля размер каван-ня, млн $ | Кошт, млн. $ | Сума сабра-ных мыт-ных пошлін млн $ | Сума мыт-ных пошлін пасля размер каван-ня, млн $ |
| РФ | 1239,14 | 921,98 | 36,88 | 38,04 | 921,98 | 36,88 | 37,91 | 921,98 | 36,88 | 37,24 |
| РБ | 174,46 | 136,03 | 5,44 | 2,03 | 132,46 | 5,3 | 2,03 | 113,51 | 4,54 | 1,99 |
| РК | 41,3 | 22,9 | 0,92 | 3,17 | 22,9 | 0,92 | 3,16 | 22,9 | 0,92 | 3,11 |

*Крыніца – Заўвага:* распрацоўка аўтара.




*Мал. 1* Сума мытных пошлін да і пасля размеркавання, розніца паміж сабранымі і атрыманымі сумамі мытных пошлін.

*Заўвага:* распрацоўка аўтара.

Такім чынам, павялічваючы агульны кошт аб'ёму ўвазімага тавару, павялічваецца і сума падатку на прыбытак (пры ўмове, што прыбытак у 5 % – велічыня пастаянная).

Каб разгледзець наступствы «лагістычнага манёўру» на вываз валюты за мяжу, для параўнання мэтазгодна ўзяць дадзеныя аб памеры валютнай выручкі і сальда ад размеркавання (валюты, якая ўвозіцца-вывозіцца).

В = 1,05*К * 30 %, дзе В – валютная выручка, 1,05*К – кошт тавару з улікам прыбытку (цана продажу), 30 % – норма абавязковага продажу валютнай выручкі.

С = Б – А, дзе Р – сальда ад размеркавання, А – сума мытных пошлін сабраных дзяржавай-членам МС, Б – сума мытных пошлін, атрыманых дзяржавай-членам МС пасля размеркавання (4,7 % для Рэспублікі Беларусь) (гл. Малюнак 2).




*Мал. 2* Параўнанне валютнай выручкі і сальда размеркавання ўвазных мытных пошлін

*Заўвага:* распрацоўка аўтара.

Асаблівую ўвагу варта звярнуць на правядзенне «лагістычнага манёўру» ў дачыненні да тавараў:

1) з нулявой стаўкай увазной мытнай пошліны (павялічваецца толькі сума падатку на прыбытак, сальда размеркавання адсутнічае)

2) увоз якіх у Рэспубліку Беларусь складае менш за 4,7 % ад агульнага кошту ўвазімых у Мытны саюз тавараў дадзенай групы («Лагістычны манеўр» прыводзіць да росту мытных пошлін пасля размеркавання толькі ў дачыненні да той катэгорыі тавараў, доля імпарту ў Рэспубліку Беларусь якіх складае да 4,7 % (з улікам «лагістычнага манёўру»).

Такім чынам, даследванне пацверджвае, што паляпшэнне лагістычнай прывабнасці Рэспублікі Беларусь прыводзіць да павелічэння грашовых паступленняў і не адмоўна не ўплывае на вываз валюты за мяжу.

**Літаратура**

1. Интернет-адрес: http://comtrade.un.org/.